В. К. ШЫНКАРЭНКА
Філалагічны факультэт,
кафедра беларускай літаратуры

# ЛІРЫЧНЫ ТВОР: МЕТАД ЦЭЛАСНАГА АНАЛІЗУ ПАЭТЫЧНАГА ТЭКСТУ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

"Уводзіны ў літаратуразнаўства" з'яўляюцца адной з абавязковых і адначасова ключавых прапедэўтычных дысцыплін, рэкамендаваных тыпавой вучэбнай праграмай для студэнтаў першага курса ВНУ па спецыяльнасці 1-21 05 01 "Беларуская філалогія". Як вядома, яшчэ з часоў антычнасці найважнейшым пытаннем у навуцы пра літаратуру застаецца яе падзел на роды, жанры, віды, што заснаваны на адметных спосабах спасціжэння мастацтвам слова рэальнасці і чалавека. Па прычыне складанасцей, якія асабліва часта выклікае ў студэнтаў вывучэнне лірыкі, спасціжэнне спецыфікі яе прыроды і разгалінаванай жанрава-відавой сістэмы, а таксама з-за істотнага скарачэння гадзін па дысцыпліне "Уводзіны ў літаратуразнаўства" ў артыкуле аддаецца перавага цэласнаму аналізу вершаванага тэксту. Абраны падыход дазволіць аб'яднаць у межах адной тэмы не толькі такія кірункі даследавання, як асаблівасці зместу і формы паэтычнага твора, але і вызначыць яго страфу, сістэму вершаскладання,

адметнасці фанетычнай і інтанацыйна-рытмічнай арганізацыі тэксту, размяшчэння радкоў, віды клаўзул і рыфмаў. Паспяховая выпрацоўка адпаведных навыкаў, звязаных з гэтым метадам, не толькі дапаможа студэнтам-пачаткоўцам у далейшым вывучэнні тэорыі і гісторыі літаратуры, успрыманні і засваенні зместу іншых літаратуразнаўчых дысцыплін, але і ў належнай ступені забяспечыць высокі ўзровень іх будучай прафесійнай падрыхтаванасці наогул.

Неабходна падкрэсліць, што ў паэзіі, а яна можа быць аўтапсіхалагічнай і ролевай, найпершым прадметам адлюстравання з'яўляецца ўнутрана-пачуццёвы вопыт лірычнага героя (або лірычнага суб'екта ці "Я"-героя), які разам з філасофска-медытатыўнымі развагамі, патрыятычнымі і інтэлектуальнымі памкненнямі, хвалюючымі ўражаннямі ад успрымання знешняга свету і апісаннямі яго асобных з'яў перадаецца ў адносна невялікіх па памеры тэкстах праз насычаную вобразную сістэму, эмацыянальнасць, экспрэсіўнасць і абумоўленую імі і ў цэлым творчай задумай мастака сугестыўнасць [1, с. 346–354].

Агульнавядома, што па тэматычным прынцыпе прынята вылучаць чатыры асноўныя разрады паэзіі. Дакладна: грамадзянскую, філасофскую, пейзажную і інтымную. Але ўяўляецца прынцыпова важным, каб пры далейшым і больш грунтоўным тлумачэнні гэтага ўсім вядомага яшчэ са школы тэзіса выкладчык змог давесці студэнтам наступнае. Пераважнае гучанне той ці іншай тэмы ў лірычным творы зусім не азначае, што яго прастора, а тым больш падтэкставы пласт, закрытыя для пранікнення іншых тэм, матываў і вобразных малюнкаў. Такі дыялектычны падыход навучыць прысутных успрымаць паэтычны тэкст як тое шматузроўневае мастацкае цэлае, што ўтрымлівае ў сабе побач з асноўным і відавочным яшчэ некалькі прыхаваных сэнсаў, і яны, разам са спасціжэннем аўтарскага духоўнага і інтэлектуальнага вопыту, абавязкова адкрыюцца будучымі выкладчыкамі і даследчыкамі пры ўважлівым прачытанні і далейшым аналізе.

Неабходна падкрэсліць, што ва ўсе часы лірыка, як і іншыя літаратурныя роды, імкнецца няспынна разнастаіць свой змест, прыёмы кампазіцыйнай і моўнай арганізацыі, відавочна не жадаючы абмяжоўвацца ўсталяванымі раней жанрамі і страфамі. І хоць многія з іх працягваюць актыўна функцыянаваць і сёння, нельга не заўважыць, што ў сучасным літаратурным працэсе выразна праступае тэндэнцыя да абнаўлення цвёрдых паэтычных форм ці ўвогуле ўтварэння індывідуальна-аўтарскіх вершаваных адзінак. Дастаткова ўзгадаць ахвярынкі Рыгора Барадуліна, вершаняты Галіны Каржанеўскай, зномы, квантэмы, вершасловы, іншыя ўласна аўтарскія жанры



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Алеся Разанава, рысасловы Людкі Сільновай, іранічную і эксперыментальную паэзію Андрэя Хадановіча, Зміцера Вішнёва, Віктара Жыбуля, Веры Бурлак і многіх іншых сучасных пісьменнікаў.

Аднак пры ўсім пошукавым характары і наватарскіх тэндэнцыях у лірыцы апошніх дзесяцігоддзяў часта сустракаюцца ўстойлівыя і вядомыя з далёкіх эпох віды верша, якія пазней атрымалі шырокае распаўсюджванне і да гэтага часу характарызуюцца нязменнасцю памераў, спосабаў рыфмоўкі, колькасці і размяшчэння радкоў. Некаторыя ўстойлівыя лірычныя формы могуць складацца як з адной самастойнай, так і некалькіх узаемазвязаных цвёрдых строф (танка, актава, дэцыма, санет, рытарнель і інш.), засноўвацца на паўторы радкоў і іх частак (трыялет, рандэль, рандо), адначасова мець уласцівасці цвёрдых і свабодных адзінак (канцона, газель, вірале, віланела і інш.).

Наўрад ці будзе плённым засваенне паняццяў па тэорыі вершаскладання без ілюстрацыі іх мастацкімі прыкладамі. Акрамя таго, праз такі падыход выкладчык атрымлівае магчымасць далучыць студэнтаў да здабыткаў як прадстаўнікоў класічнай сусветнай і нацыянальнай літаратуры, так і творчасці сучасных аўтараў.

Скажам, няма формы, у якой Ніл Гілевіч не адчуваў бы сябе патворчаму разняволена. Пра жанрава-стылявыя пошукі пісьменніка ў свой час засведчыў яго лірычна-спавядальны зборнік “Актавы” (1976). Медытатыўна-філасофскім васьміратдкоўям аўтара ўласцівы вытанчанасць, гутарковая нязмушанасць, пэўныя адступленні ад кананічнай формы праз разнастайную кампаноўку сугуччаў, складанне з двух катрэнаў (часам аддзеленых графічна) з цеснай інтанацыйна-сінтаксічнай сувяззю, сэнсавым адзінствам твора, перакрыжаванай або кальцавой рыфмоўкай. І што цікава, зямная аснова, сялянская закваска, цвярозая рацыянальнасць нікольві не ўплываюць, ніяк не змяншаюць вастрыню светаўспрымання паэта, што натуральна пачувае сябе гаспадаром, адказным як за лад у сваёй хаце і падвор’і, так і на ўсёй зямлі.

“Сямірадкоўі” (2002) Ніла Гілевіча, а да гэтай вершаванай формы, як і да актаў, пісьменнік звяртаецца на працягу ўсёй творчасці, характарызуюцца шырокай варыянтнасцю сугуччаў, дасціпнасцю стылю, энергіяй думкі, акцэнтацыяй на маральна-этычных пытаннях пры ўсёй разнастайнасці тэм, глыбіні і дакладнасці перажыванняў. Здзіўляе, што аўтару і сямі безназоўных радкоў хапае для таго, каб перадаць не толькі ўласна набалелае, але і боль усяго Сусвету.

Аднолькава таленавіта пісьменнік выкарыстоўвае такія строфы, як катрэны, пяцірадкоўі, секстыны, санеты, вянок санетаў і інш. Да



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

прыкладу, гілевічаўская кніга лірычных мініяцюр "На флейце самоты" (2004) напісана ў жанры танка і адрозніваецца дакладнасцю, афарыстычнасцю і паэтычнай ёмістасцю зместу гэтай унікальнай для беларускага вершаскладання строгай формы. У самым пачатку кнігі, адкрываючы знешне не мудрагелісты сакрэт напісання танка, пісьменнік нібы правакуе чытача далучыцца да паэтычнай гульні: *Трыццаць адзін склад / Уціснуць у пяць радкоў / Строга па схеме: / Пяць-сем-пяць-сем-сем, – і ўсё! / Вось вам, сябры, і "танка"* [2, с. 5]. Для самога Ніла Гілевіча дадзеная сціслая форма – яшчэ адна магчымасць выявіць выключную сілу лірычнай душэўнасці і ўлюбёнасці ў акаляючы свет, яго квецень, музыку, што злучае неба і зямлю, а таксама перадаць стрыманы неспакой ці адкрыты боль за абыякавае стаўленне да лёсу і мовы нацыі, бездухоўнасць сучаснікаў.

Адметна, што ў айчыннай паэзіі апошніх дзесяцігоддзяў даволі распаўсюджаны жанр хоку (хайку) – нерыфмаваны, з філасофскім сэнсам, што высякаецца на мяжы імгненнага назірання і глыбокай думкі, спалучэння агульнага і канкрэтнага планаў, японскі верш-мініяцюра, тры радкі якога ўтвараюцца адпаведна з пяці, сямі, пяці складоў. Паспяхова авалодалі гэтай складанай (пры ўсёй яе сцісласці) формай Адам Глобус, Міраслаў Шайбак, Максім Клімковіч, Уладзімір Сіўчыкаў, Уладзімір Арлоў, Віктар Шніп, Аксана Спрынчан, іншыя пісьменнікі.

У сучаснай паэтычнай практыцы актыўна выкарыстоўваецца жанр класічнага санета, які складаецца з чатырнаццаці радкоў пяці-, радзей чатырох- ці шасцістопнага ямба і спалучае ў сваёй структуры два катрэны з рыфмоўкай *abba abba* ці *abab abab* і два тэрцэты з рыфмоўкай *ccd eed* ці *cdc dcd*. Прычым, калі ў катрэнах мы маем магчымасць назіраць за развіццём тэмы, то ў тэрцэтах адбываецца кульмінацыя і развязка ў выглядзе высновы-маралі. Акрамя санетаў, сённяшнімі аўтарамі плённа ствараюцца вянкі санетаў (архітэктанічнае кальцо з чатырнаццаці санетаў, дзе кожны наступны пачынаецца з апошняга радка папярэдняга санета, а заключны пятнаццаты – магістрал – складаецца з першых радкоў усіх ранейшых чатырнаццаці санетаў). Тут дастаткова ўзгадаць Ніла Гілевіча, Янку Сіпакова, Ніну Мацяш, Віктара Шніпа, Людмілу Рублеўскую, Эдуарда Акуліна і інш. Асаблівых поспехаў у напісанні вянка вянкоў санетаў, гэтага складанага структурнага ўтварэння, што ўключае ў сябе пятнаццаць вянкоў санетаў, апошні з якіх складаецца з магістралаў усіх папярэдніх вянкоў санетаў, дасягнулі Змітрок Марозаў, Соф'я Шах.

Але трэба сказаць, што некаторыя аўтары, наадварот, не прытрымліваюцца строгіх канонаў жанру санета і спрабуюць змяніць

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

яго адметную форму, стварыць "эксперыментальныя" санеты праз сінтэз некалькіх паэтычных структур. Скажам, Юрась Пацюпа ў цыкле "Мэзальянсы, або Юрлівыя санеты", спалучае санет і брахікалан, санет, газель, туюг. У якасці арыгінальных прыкладаў варта назваць таксама "Мудрагелістыя санеты" і "Крынскія санеты" Андрэя Хадановіча, "Мінскія / Менскія санеты" Сяржука Мінскевіча, творы іншых пісьменнікаў.

З вялікай колькасці існуючых літаратуразнаўчых пытанняў у дадзеным артыкуле мы свядома вынеслі на абмеркаванне праблему сучаснага стану некаторых цвёрдых лірычных жанраў. Пры адноснай знешняй устойлівасці сёння яны перажываюць заўважныя зрухі, дыфузію, назіраецца ўтварэнне новых індывідуальна акрэсленых вершаваных адзінак праз спалучэнне некалькіх структур, эксперыментатарства. Не можа не суцяшаць тое, што пошукавы характар развіцця сучаснай паэзіі, яе праблемна-тэматычнае і структурнае абнаўленне ў большасці выпадкаў менавіта праз таленавітае ўвасабленне задуманага, узважаны падыход да традыцый, разумнае стаўленне да існуючай ва ўсе эпохі апазіцыі свабода / рэгламентацыя (паводле Ю. Борава) дазваляе пісьменнікам дасягаць адзінства зместу і формы, эстэтычнай цэласнасці створанага імі. Якраз захаванне гэтага асноўнага закона мастацтва і забяспечвае жанравую разнастайнасць і плённае функцыянаванне лірыкі ў сучасным літаратурным працэсе.

**Літаратура**

1. Хализев, В. Е. Теория литературы: учебник / В. Е. Хализев. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : Высш. школа, 2002. – 437 с.

2. Гілевіч, Ніл. На флейце самоты: Лірычныя мініяцюры ў жанры "танка" / Ніл Гілевіч. – Мінск: Выд-ва "Про Хрысто", 2005. – 32 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ